# Правапіс прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса -ск-

# Мэта ўрока:

- Фарміраваць веды пра правапіс прыметнікаў, утвораных пры дапа-мозе суфікса -ск-
- Выпрацоўваць навык абгрунтаванага беспамылковага напісання прыметні-каў, утвораных пры дапамозе суфікса -ск-

[гарацк’і ] [студэнцк’і ]
[восен’ск’і ] [хатынск’і ]
[палеск’і ] [б’элав’эск’і]

- гарадскі студэнцкі
- восеньскі хатынскі
- палескі белавежскі

**1 + 1= 1        2 + 1=1**

беларус + ск = беларускі

матрос + ск = матроскі

Палессе + ск = палескі

**С + СК = СК**

**СС + СК = СК**

студэнт + -ск- =студэнцкі

немец + -ск- =нямецкі

ткач + -ск- =ткацкі

мастак + -ск- =мастацкі

ц
т
ч
к

+ -ск- = цк

цётачка

# Д + СК =ДСК

- ✧ **сусед + ск = суседскі**
- ✧ **завод  + ск = заводскі**
- ✧ **горад + ск = гарадскі**

**[сус'эцкі][завоцкі][гарацкі]**

# Мяккі знак перад суфіксам -ск-

Ь ~~Ь~~

прыметнік утвораны ад :

- назваў месяцаў на нь

  снежаньскі

  ліпеньскі

- восеньскі

- іншага назоўніка на нь

  Любань–любанскі

  Хатынь –хатынскі

## Геаграфічныя назвы, назвы народнасцей і нацыянальнасцей

- Каўказ + -ск- = каўказскі
- Нясвіж + -ск- = нясвіжскі
- Добруш + -ск- = добрушскі
- Буг + -ск- = бугскі
- таджык + -ск- = таджыкскі
- казах + -ск- = казахскі

**У геаграфічных назвах, назвах народнасцей і нацыянальнасцей літары**

**З Ж Ш Г К Х   захоўваюцца**

# Але! Чаргаванні

- Г : Ж

Рыга – рыжскі Калуга – калужскі

- К : Ц

калмык – калмыцкі турак –турэцкі

- Х : Ш

Чэхія – чэшскі

# Алгарытм напісання прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса -ск-

1.Якая апошняя літара(-ы) утваральнай асновы?

Д | С | НЬ | Ц,Т,Ч,К | Г,Ш,Х,К,З,Ж

2. ДСК | СК | НЬСК | НСК | ЦК | нязменна

(назвы месяцаў, восень) | (іншыя назоўнікі) | (у геаграфічных назвах, назвах народнасцей і нацыян.)

# Утварыце прыметнікі пры дапамозе суфікса -ск-

- Брэст
- мастак
- Свіслач
- Кубань
- Вільнюс
- ліпень
- салдат
- Калінінград
- гігант

- брэсцкі
- мастацкі
- свіслацкі
- кубанскі
- вільнюскі
- ліпеньскі
- салдацкі
- калінінградскі
- гіганцкі

# Устаўце прапушчаныя літары

Адвака…кі, юна…кі, кана…кі,пале…-кі, каўка…скі, восен…кі, гара…кі, нясві…кі, тка…кі, калмы…кі, асіпо-ві…кі.

Правер сябе

Адвакацкі,юнацкі,канадскі, палескі,каўказ-скі, восеньскі, гарадскі, нясвіжскі, ткацкі, калмыцкі, асіповіцкі.

## Вызначце чацвёртае «лішняе» слова з кожнага радка

- белару…кі, адэ…кі, Пале…е, матро…кі
- гара... кі, лю... кі, сакаві... кі, сусе...кі
- студэн... кі, гіган... кі, маста... кі, заво…кі
- снежан…скі, хатын …скі, восен...скі, ліпен …скі

## Правер сябе

Палессе, сакавіцкі, заводскі, хатынскі

## Выпраўце памылкі, дзе яны ёсць

Гарацкі, студэнтскі, грамадскі, гігантцкі, палесскі, суседцкі, матроскі, братскі, восенскі, конскі, французкі, швецкі, універсітэцкі,брэсцкі,вільнюскі, жнівеньскі, белавешскі, турыс-цкі .

# Падказка

Гарацкі, студэнтскі, грамадскі, гігантцкі, палесскі, суседцкі, матроскі, братскі, восенскі, конскі, французскі, швецкі, універсітэцкі,брэсцкі,вільнюскі, жнівеньскі, белавешскі, турыс-цкі .

# Правер сябе

**Гарадскі, студэнцкі, грамадскі, гіганцкі, палескі, суседскі, матроскі, брацкі, восеньскі, конскі, французскі, шведскі, універсітэцкі,брэсцкі,вільнюскі, жнівеньскі, белавежскі, турыс-цкі .**

# ТЭСТ

1.*Вызначце, якое сцверджанне правільнае*

**а)** у прыметніках, утвораных пры дапамозе суфікса -ск- каранёвае ***с*** і суфіксальнае ***с*** на пісьме перадаюцца літарамі ***сс***

**б)** спалучэнне каранёвага ***д*** з суфіксальным ***с*** на пісьме перадаецца літарай ***ц***

**в)** спалучэнне каранёвых зычных ***ц,т,ч,к*** з суфіксальным ***с*** перадаецца на пісьме ***ц***

***2.Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску неабходна ўставіць ц***

а) чыта…кі

б) фінлян…кі

в) прэзідэн…кі

г) лабаран…кі

д) сусе…кі

3. ***Вызначце пятае «лішняе» слова***

а) красаві…кі

б) грама…кі

в) салда…кі

г) прапагандыс…кі

д) гіган…кі

***4. Адзначце правільна напісаныя прыметнікі***

а) варонешскі

б) дэпутатскі

в) універсітэцкі

г) гарадскі

д) жнівеньскі

## Самаацэнка

1. Справіўся без памылак
2. Дапусціў 1-2 памылкі
3. Дапусціў больш за 2 памылкі

## *Адказы*

1. В
2. АВГ
3. Б
4. ВГД

# Правапіс прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса -ск-